В.А.Касап, Р.А.Ровіна

**Бібліяграфічныя дапаможнікі па прыродазнаўчых навуках**

Агляд бібліяграфічнай прадукцыі прыродазнаўчай тэматыкі, выдадзенай на працягу 1991-95 гг., сведчыць, што найбольш важкія бібліяграфічныя дапаможнікі выйшлі пад эгідай ЦНБ імя Я.Коласа АН Беларусі.

Перш за ўсё трэба адзначыць чарговыя выпускі паказальнікаў, якія прысвечаны жывёльнаму і расліннаму свету рэспублікі. Паказальнік "Животный мир Беларуси" (447(1992 г.)) змяшчае звесткі аб дакументах на беларускай і рускай мовах за 1985-89 гг. Паказальнік часткова анатаваны. За гэты ж перыяд часу адлюстроўвае літаратуру і другі паказальнік "Флора и растительность Белоруссии" (430(1992 г.)).

Сярод фундаментальных дапаможнікаў неабходна адзначыць выданы ў 1992 г. паказальнік "Природа Беларуси" (166(1992 г.), 468(1994 г.), 502(1995 г.)), у якім у сістэматычным парадку адлюстраваны каля 2,5 тыс. кніг, аўтарэфератаў, матэрыялаў канферэнцый, сходаў, сімпозіумаў на беларускай і рускай мовах. Наступныя выпускі паказальніка рыхтуюцца ў аўтаматызаваным рэжыме.

Акрамя гэтых традыцыйных для бібліятэкі дапаможнікаў, у 1992 г. упершыню ў рэспубліцы быў надрукаваны шматгаліновы паказальнік "Естественные науки. Техника. Сельское хозяйство. Медицина" (165(1992 г.)), у якім паказаны выдадзеныя на тэрыторыі рэспублікі кнігі з 1861 па 1917 год.

Значнае месца ў масіве дапаможнікаў належыць персанальным паказальнікам. Асноўная маса іх надрукавана ў часопісах "Дифференциальные уравнения", "Журнал прикладной спектроскопии", "Вестник Белорусского государственного университета" і інш., а таксама ў кнігах адпаведнага зместу, што можна разглядаць як станоўчы фактар. Сярод такіх дапаможнікаў можна адзначыць "Список научных трудов А.В.Бицадзе" (235(1991 г.)), "Список избранных научных трудов В.М.Матросова" (359(1993 г.)), "О научном наследии А.С.Ахматова" (534(1993 г.)) і інш.

Як і ў галіне тэхнікі, дастаткова вялікае развіццё атрымала публікацыя аглядаў літаратуры па сучасных актуальных праблемах у перыядычных выданнях. Такія агляды характэрны для ўсіх галінаў прыродазнаўчага комплексу ((668(1994 г.), 705(1994 г.), 685(1995 г.)) і інш.

Бягучае інфармаванне спецыялістаў ажыццяўлялася шляхам выпуску анатаваных паказальнікаў. Так, на працягу разглядаемага перыяду, штоквартальна з 1990 г. выходзіў паказальнік "Программные средства учебного назначения" (180,948(1992 г.), 316, 364(1993 г.)), с 1978 г. (па паўгоддзях) "Аннотированный библиографический указатель литературы по гидрологии" (518(1991 г.), 386(1992 г.), 728(1993 г.)) і штомесячна "Информационно-библиографический указатель новых поступлений документов" (519(1991 г.), 338(1992 г.)).

В.А.Касап, Р.А.Ровіна

**Бібліяграфічныя дапаможнікі па медыцыне**

У параўнанні з другімі галінамі народнай гаспадаркі медыцына параўнальна някрэпна забяспечана інфармацыйнай прадукцыяй, у тым ліку і